# ВОРАНАЎСКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА

**17 студзеня.** Супрацоўнікі *раённай бібліятэкі* падрыхтавалі для вучняў 11 "Б" класа Воранаўскай СШ займальную краязнаўчую квэст-гульню "Я ў гэтым пасёлку жыву. Я гэты пасёлак ведаю", прысвечаны ***80-годдзю ўтварэння Воранаўскага раёна***. На старце прысутныя падзяліліся на 2 каманды: "Полымя" і "Следапыты", атрымалі маршрутныя карты, з адзначанымі станцыямі: "Краязнаўчая", "Літаратурная", "Вулічная", "Заключная". На кожнай станцыі ўдзельнікі выконвалі заданні, адказвалі на пытанні, успаміналі аб гісторыі пасёлка, аб яго славутасцях, аб раслінным і жывёльным свеце і атрымлівалі за гэта балы. Прайшоўшы ўсе выпрабаванні, удзельнікі сабраліся на заключнай станцыі каб сабраць пазлы будынка, які знаходзіцца ў гарадскім пасёлку Воранава.

**5 лютага.** Адчуць асалоду ад цудоўнай паэзіі, паразмаўляць, паслухаць і пачытаць вершы на роднай мове мелі магчымасць вучні 11 "А" класа Воранаўскай СШ падчас літаратурна-музычнага вечара "Воранаўшчына – маё натхненне: край у творчасці землякоў-паэтаў". Чыталі насычаныя творы Уладзіміра Руля, Валянціна Емельянава, Аляксандра Мацюка, Міхаіла Забалотнага, Марыі Казлоўскай, пранізаныя пяшчотай і незвычайнай любоўю да родных мясцін, сваёй мовы, людзей, якія жывуць тут.

**18 лютага.** Гістарычна-патрыятычны ўрок "Трагедыя і доблесць Афганістана" прайшоў у *раённай бібліятэцы*. Бібліятэкары пазнаёмілі навучэнцаў "Воранаўскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа сельскагаспадарчай вытворчасці" з гістарычнымі падзеямі вайны ў Афганістане, як мужна і прафесійна выконвалі свой абавязак нашы салдаты, як у найскладанейшых умовах праяўлялі мужнасць, стойкасць, высакароднасць, захоўвалі вернасць ваеннай прысязе і абавязку. Гарталі старонкі кнігі "Памяць", дзе можна знайсці імёны землякоў загінуўшых у баявых дзеяннях у Афганістане.



У мерапрыемстве прымаў удзел старшыня раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане", удзельнік ваенных дзеянняў у Афганістане Гендрык Казіміравіч Мікутайціс. Затаіўшы дыханне хлопцы слухалі ўспаміны аб цяжкай і небяспечнай ваеннай службе. Свой расказ ён засяродзіў на тым, якое вялікае значэнне мае ў арміі паразуменне, надзейнасць і падтрымка адзін аднаго, паказаў свае ўзнагароды, адказваў на пытанні хлопцаў. Да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава "Афганістан баліць у душы маёй...".

**20 лютага.** 75-годдзю з дня нараджэння беларускай пісьменніцы Таісы Бондар была прычвечана літаратурна-паэтычная гадзіна "Паэзія душы". Удзельнікі сустрэчы пазнаёмілімя з біяграфіяй і творчасцю пісьменніцы, зрабілі агляд яе твораў.

**21 лютага**. Свята роднай мовы "На мове сэрцу зразумелай" прапанавалі супрацоўнікі бібліятэкі вучням 10-11 класаў Воранаўскай СШ. Яно было накіравана на папулярызацыю беларускай мовы, выхаванне ў школьнікаў павагі і любві да роднага слова, цікавасці да твораў беларускіх пісьменнікаў. Увазе вучняў была прадстаўлена кніжная выстава "Гукі роднай мовы пахнуць верасам і мятай", на якой змяшчаліся кнігі пра гісторыю беларускай мовы, беларускія часопісы, аўдыя-кнігі з творамі беларускай літаратуры, а значную частку займалі кнігі беларускіх аўтараў — як класікаў, так і сучаснікаў.

У атмасферы добразычлівасці прайшла размова пра гісторыю ўзнікнення Дня роднай мовы, пра неабходнасць яе захавання.

Падчас апытання "Якое беларускае слова вы найбольш часта ўжываеце ў паўсядзённым жыцці?" ў лідэры выйшла слова "Дзякуй!".



Свята запомнілася ўсім. Кожны вучань зразумеў, што трэба любіць і шанаваць родную мову, бо менавіта ў мове захавана гісторыя нашага народа, сіла і краса народнага слова.

**28 лютага**. Напярэдадні Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам прайшла інфармацыйна-асветніцкая

гутарка “Наркотыкі – выкрадальнікі розуму”. Яна прадугледжвала сустрэчу старшага оперупаўнаважанага групы па наркакантролю Кугелевіча Сяргея Станіслававіча і навучэнцаў Воранаўскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама прагляд і абмеркаванне фільмаў і ролікаў па гэтай тэме і многае іншае.

**5 сакавіка** вечар адпачынку “Шчасця і радасці Вам, Жанчыны!” прайшоў з ўдзельнікамі аматарскага аб'яднання “Надзея”. У атмасферы радасці, вясны і паэзіі удзельнікі сустрэчы чыталі вершы, спявалі, віншавалі адзін аднаго.



Жанчынам было прапанавана паказаць свае веды і ўменні ў эрудыцыі, кемлівасці і творчасці, а таксама прыняць удзел ў вясёлых конкурсах і віктарынах. Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава-настрой “Харашэе свет ад дабрыні жаночай”, якая знаёміла з гісторыяй ўзнікнення свята, з кнігамі сучасных пісьменніц, выказваннямі знакамітых людзей пра жанчын, з артыкуламі з перыядычных выданняў аб іміджы, жаночых прычосках, догляду за асобай.

**21 сакавіка**. Гадзіна краязнаўства “Аб сабе хачу пакінуць памяць” прысвячалася 180-годдзю з дня нараджэння Ф.Багушэвіча, класіка беларускай літаратуры, аднаго з самых прыкметных фігур у айчыннай літаратуры XIX стагоддзя. Мерапрыемства знаёміла з вершамі паэта і творамі прысвечанымі яму.

## З ЛЮБОЎЮ ДА РОДНАГА КРАЮ
## (да Году малой радзімы)

15 студзеня Воранаўскі раён адзначыў **80-годдзе** з часу ўтварэння.

У *Радунскай ГПБ* адбыўся літаратурны вечар “Паэтычныя дараванні зямлі Воранаўскай”. На вечар былі запрошаны землякі сталага ўзросту. Да іх увагі былі прадстаўлены вершы нашых землякоў: Уладзіміра Руля, Міхаіла Забалотнага, Аляксандра Сакалова, Валянціна Емяльянава, Зыгмунда Дзікевіча, Марыі Казлоўскай. Прайшліся шляхамі па мінулым Воранаўшчыны, дзяліліся ўраджаннямі, успаміналі былое, прыпаміналі гады, калі пераехалі на месца жыхарства ў Воранаўскі раён.




*Воранаўская ДБ* прапанавала вучням 7 “А” класа адправіцца ў вандроўку ў мінулае “Вобразы мілыя роднага краю”. Бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з гісторыяй утварэння і станаўлення раёна за ўвесь перыяд развіцця, а таксама са знакамітымі людзьмі Воранаўшчыны. Таксама дзіцячая бібліятэка для вучняў першых класаў правяла экскурсію-знаёмства “Славім працаю сваю зямлю”, якая прайшла ля раённай Дошкі гонару. Пазнаёмілі дзяцей з людзьмі розных пакаленняў, прафесій, якія пакідаюць след у паўсядзённым жыцці, гісторыі свайго краю.

Завочнае падарожжа “Па вуліцах маёй вёскі” *Бастунская ІСБ* прысвяціла Году малой радзімы і прапанавала для дзяцей. Размова вялася пра гісторыю ўзнікнення вёскі Бастуны, пра таленавітых і славутых людзей, якія нарадзіліся і жывуць у вёсцы, пра гісторыю бібліятэкі, школы, чыгуначнай станцыі. У завяршэнні мерапрыемства бібліятэкар пазнаёміла з кніжнай выставай “Тут радзімы маёй пачатак” і мультымедыйнай прэзентацыяй “Па вуліцах роднай вёскі”.

Супрацоўнікі *Воранаўскай ДБ* робяць добрую справу – адраджаюць традыцыі нашых продкаў, дораць свята дзецям. Вячоркі “Добры вечар, Шчодры вечар”! арганізавалі бібліятэкары з вучнімі 4-5 класаў. Удзельнікам свята прадставілася магчымасць паслухаць калядныя песні, успомніць прыказкі і прымаўкі аб марозе, адгадаць загадкі.

Таксама ў *дзіцячай бібліятэцы* прайшлі рэлігійныя чытанні “В каждом доме торжество – все встречают Рождество”. Наведвальнікі бібліятэкі мелі магчымасць пазнаёміцца з святочнай кніжнай выставай “Віфліемская зорка”, прачытаць урыўкі з мастацкіх і рэлігійных твораў аб нараджэнні Божага сына. Удзельнікамі чытанняў сталі не толькі дзеці, але і дарослыя.

Вусны часопіс "Ліда - культурная сталіца" прапанавала бібліятэкар *Больцішскай ІСБ.* З дапамогай электроннай прэзентацыі дзеці пазнаёміліся з гісторыяй горада і яго славутасцямі.

## ДА 75-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

Работа бібліятэк у бягучым годзе накіравана на святкаванне **75-годдзя Перамогі** ў **Вялікай Айчыннай вайне**. У кожнай бібліятэцы складзены план святочных мерапрыемстваў. У гонар знамянальнай даты аформлены кніжныя выставы: "Дарогі вайны – дарогі Перамогі", "Победной дате – 75!", "Праз полымя вайны", "Вялікая Перамога – вечная слава", "Была война. Была Победа", "Вялікая Перамога: час і памяць", сярод бібліятэк аб'яўлены інтэрнэт-праект "Мы о войне стихами говорим".

## ДЗЕНЬ ЮНАГА ГЕРОЯ-АНТЫФАШЫСТА

*Пагародзенская СБ* запрасіла вучняў 3 класа на гадзіну мужнасці "Уставалі ў строй хлапчукі баявыя". Бібліятэкар расказала дзецям пра юных герояў, якія не толькі дапамагалі ў тыле, але і нараўне з дарослымі хадзілі ў разведку і прыносілі важныя звесткі ў партызанскія атрады, здзяйснялі легендарныя подзвігі. Таксама да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава "Героі застаюцца ў страі".

На гадзіну літаратурнай памяці "Дзеці суровай пары ліхалецця" бібліятэкары *Воранаўскай ДБ* запрасілі вучняў 4 "Д" класа Воранаўскай СШ. Бібліятэкары падрыхтавалі кароткія паведамленні пра подзвігі піянераў-герояў зрабілі агляд кніжнай выставай "Дзеці суровай пары ліхалецця".

## ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ ВОІНАЎ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАЎ

Вучні 8 класа Радунскай СШ прсталі ўдзельнікамі вечара памяці "Афганістан баліць у душы маёй" які арганізавалі бібліятэкары *Радунскай ГПБ.* У рамках мерапрыемства была арганізавана слайд-прэзентацыя аб цяжкіх і небяспечных ваенных буднях нашых салдат. Гучалі вершы і песні, напісаныя афганцамі, паказаны кадры відэахронікі. Памяць пра тыя падзеі захоўваюць фатаграфіі, артыкулы ў газетах і кнігі, якія былі прадстаўленыя на выставе "Афганістан баліць у маёй душы".

У *Воранаўскай ДБ* прайшла гадзіна памяці "Душа, абпаленая вайною".У мерапрыемстве прымалі ўдзел вучні 5 "Е" Воранаўскай СШ. Размова вялася пра трагічныя падзеі афганскай вайны, пра вывад нашых войскаў з тэрыторыі Афганістана, пра боль і страты нашага народа.

## ДЗЕНЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ

*Воранаўская ДБ* арганізавала фотакалаж "Мой тата быў салдатам" з вучнямі 5 "А" класа. З якой цікавасцю разглядалі дзеці фотаальбомы татаў і дзядуляў, якія калісьці выконвалі свой воінскі абавязак! З вуснаў дзяцей гучалі вершаваныя пажаданні татам. Хлопчыкі расказалі, у якіх войсках яны мараць служыць.

Мерапрыемства прадоўжылі "ваенныя вучэнні": эстафеты "Дастаў важнае данясенне", "Перанясі снарады", "Мінное поле"; конкурс "Збяры танк і карабель", гульня "Хто першы?", "Трапіць у цэль", "Салдат, будзь уважлівы!" Усе заданні садзейнічалі выхаванню у хлопчыкаў такіх мужчынскіх якасцяў, як смеласць, вынослівасць, трапнасць, уважлівасць, сіла.

## БІБЛІЯТЭКА – ДЗЕЦЯМ

Бібліятэкары *Воранаўскай ДБ* арганізавалі ў дзіцячым аддзяленні Воранаўскай раённай бальніцы гучныя чытанні твораў "Кніга – лекар для душы". З цікавасцю паслухалі казкі з кнігі "Сказки о дружбе". Пасля гэтага з задавальненнем прымалі ўдзел у інтэлектуальных і літаратурных гульнях.

Ветліва сустрэла ў сваіх сценах з экскурсіяй "У гасцях кніжнага царства" вучняў 1-га класа Паляцкішскай СШ таксама *Воранаўская ДБ.* У гульнёвай форме дзеці пазнаёміліся з бібліятэкай, правіламі карыстання кнігамі, паспрабавалі сябе ў якасці выратавальнікаў у гульнёвым пакоі "Обучайка", прынялі ўдзел у віктарыне. З задавальненнем гарталі старонкі кніг і часопісаў, адгадвалі загадкі.

Гучныя чытанні твораў "Свет казак" прапанавала *Больцішская ІСБ.* Спачатку дзеці пазнаёміліся з выставай новых твораў, затым з цікавасцю слухалі казкі, якія чытала бібліятэкар.

Бібліятэкар *Больцішскай ІСБ* правяла ўрок прафарыентацыі "Мая прафесія - мая будучыня" для вучняў старэйшых класаў Больцішскай БШ. Расказала аб разнастайнасці прафесій і іх важнасці для людзей, аб асноўных момантах, на якія варта звярнуць увагу пры выбары будучай прафесіі.

Падрабязна расказала аб прафесіі бібліятэкара. Таксама ўвазе дзяцей былі прадстаўлены факты з гісторыі ўзнікнення прафесіі бібліятэкара, былі раскрыты функцыі сучаснага бібліятэкара і яго роля ў інфармацыйнай прасторы.



У *Больцішскай ІСБ* адбылася віктарына “Калі ласка, ці староннім уваход дазволены” для вучняў малодшых класаў Больцішскай БШ. Віктарына праходзіла з вясёлымі загадкамі, конкурсамі, пацешнымі гульнямі а таксама з разгадваннем рэбуса.

“Тут жывуць кнігі” - з такіх слоў пачалася экскурсія ў *Жырмунскую ІСБ* для выхаванцаў дзіцячага сада. Дзеці здзейснілі займальнае падарожжа ў свет кніг, слухалі як правільна звяртацца з кнігай, як паводзіць сябе ў бібліятэцы, з захапленнем разглядалі прыгожыя дзіцячыя кнігі.



У *Воранаўскай ДБ* прайшоў урок бяспекі “Выратавальнік - прафесія века” з удзелам вучняў 2 “Г” класа. Гаварылі пра складаную і цікавую працу выратавальніка, якімі якасцямі павінен валодаць выратавальнік, ці кожны чалавек можа стаць ім, чаму так неабходная прафесія выратавальніка і што трэба рабіць, каб у выратавальнікаў было менш работы. У гульнёвай форме абмеркавалі небяспечныя ітуацыі, паразважалі, калі агонь сябар, а калі вораг, адказвалі на пытанні віктарыны і адгадвалі загадкі, а таксама складалі пазлы.

*Бастунскую ІСБ* наведалі вучні аздараўленчага лагера “Калакольчыкі”, каб прыняць удзел у кніжнай майстэрні “Кніжкіна бальнічка”. На пачатку сустрэчы бібліятэкар чарговы раз нагадала дзецям правілы беражлівых адносін з кнігамі. Былі падрыхтаваны кнігі, якія мелі патрэбу ў рамонце. Дзеці з вялікай адказнасцю падышлі да “лячэння” кніг.

## ДА ДНЯ БЯСПЕКІ

У рамках акцыі да адзінага дня бяспекі ў *Радунскай ГПБ* праведзена гадзіна інфармацыі “Наша безопасность в наших руках” з малодшымі школьнікамі Радунскай СШ. Вялі размову з вучнямі пра надзвычайныя сітуацыі, якія могуць адбыцца з імі дома і на вуліцы, пра выкананне асноўных правіл паводзін дзяцей на вуліцах з мэтай папярэджання дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму. А каб праверыць веды школьнікаў ім задаваліся практычныя заданні.



У *Бастунскай ІСБ* адбылася прафілактычная гутарка “Я познаю безопасный мир” з вучнямі млодшага школьнага ўзросту. Бібліятэкар нагадала дзецям аб правілах бяспечных паводзін дома, на вуліцы, на дарозе. Усе разам прымалі ўдзел у віктарыне “Дарожная азбука”. У канцы мерапрыемства была паказана прэзентацыя “Правілы бяспекі”.

*Воранаўская ДБ* запрасіла курсанта МНС Багдзевіча Анатоля Антонавіча і вучняў 3 “Б” класа на пазнавальную гадзіну “Агонь - сябар і вораг чалавека”. Тэма мерапрыемства: бяспека чалавека ў сучасных умовах, правілы паводзін ў экстрэмальных сітуацыях, неабходнасць выканання мер бяспекі. Праглядзелі цікавыя відэаролікі, адказалі на пытанні, вялі размову пра нялёгкую і адказную працу выратавальніка, пра сучасную тэхніку, з дапамогай якой выконваюцца заданні рознай складанасці, пра сітуацыі барацьбы за жыццё.

*Канвелішская СБ* запрасіла дзяцей прыняць удзел у віктарынах “Дарожныя знакі” і “Азбука бяспекі”. Таксама гулялі ў гульні: “Чырвоны. Жлўты. Зялёны”, “У госці да дарожных знакаў”, “Бяспечная дарога”.

## ПРА ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

Гадзіну карыснай інфармацыі “Рэцэпты здаровага ладу жыцця” прапанавала *Бастунская ІСБ* для вучняў Бастунскай БШ. Бібліятэкар расказала дзецям пра здароўе і здаровы лад жыцця, а менавіта пра выкананне правіл асабістай гігіены, правільнае і рацыянальнае харчаванне, заняткі фізкультурай. Таксама пазнаёміла дзяцей з дзіцячымі энцыклапедыямі і павучальнымі мастацкімі кнігамі па гэтай тэматыцы.

**Да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам.**

У *Забалацкай ІСБ* прайшла інфармацыйна-асветніцкая гутарка “Супраць бяды разам” з праглядам фільма, асноўная думка якога: стаць наркаманам лёгка, але як гэта страшна - быць наркаманам. Спецыяльна для мерапрыемства былі аформлены буклеты: “Легенды і міфы аб наркотыках”, “Наркотыкі і падлетак”, “Ля краю бездані”, памятка аб шкодзе наркаманіі.

*Бастунская ІСБ* прапанавала дзецям гадзіну інфармацыі “Скажы наркотыкам – НЕ”. Была прадстаўлена электронная прэзентацыя, з дапамогай якой успомнілі аб карысных звычках і пра найбольш небяспечных для здароўя шкодных, такіх, як курэнне, алкаголь, наркаманія і таксікаманія. Падлеткі актыўна ўключыліся ў размову, прыводзілі прыклады з жыцця аб тым, як шкодныя звычкі згубна ўплываюць на здароўе і паводзіны чалавека, разважалі над тым, ці варта звязваць сваё жыццё з ужываннем алкаголю і іншых псіхатропных рэчываў.

У *Радунскай ГПБ* была праведзена гутарка-інфарміна “Наркотык і падлетак”. Бібліятэкары праінфарміравалі падлеткаў пра небяспеку, якую тояць наркотыкі, аб крымінальнай адказнасці за іх ужыванне. У завяршэнне мерапрыемства школьнікі выказалі сваё адмоўнае стаўленне, намаляваўшы плакат “Мы супраць наркотыкаў!”.

У *Пагародзенскай СБ* для падлеткаў быў арганізаваны ўрок інфармацыі “Правильного курса держись: выбирай не наркотики а жизнь”, на якім прысутныя глядзелі відэаматэрыял аб жыцці і паводзінах наркаманаў. Пасля прагляду адбылося абмеркаванне фільма. Да мерапрыемства была аформлена кніжна-ілюстрацыйная выстава “Умей сказаць НЕ!”.

## ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

Для людзей сталага ўзросту бібліятэкар *Місявіцкай СБ* правяла фальклорнае свята “Жывая вада бацькоўскіх крыніц”. Падчас якога ўдзельнікі пабывалі на вячорках. Усім спадабаліся вясёлыя конкурсы, гульні, жартоўныя загадкі. Разам спявалі калыханкі, расказвалі небыліцы, успомнілі прыказкі і прымаўкі, лічылкі, удзельнічалі ў выкуп-аўкцыёне фантаў, успаміналі, аб звычаях, правілах паводзін у іх сем’ях, як жылі іх дзяды і прадзеды, нагадвалі народныя прыметы, выконвалі старадаўнія песні і танцы.

На конкурсна-гульнёвую праграму “Гадзіна вясёлых пытанняў” ў *Радунскую ГПБ* таксама былі запрошаны людзі сталага ўзросту. Госці мелі магчымасць прыняць удзел у гульні пад назвай “Прыз у загадках”. Гучалі самыя незвычайныя, самыя запутаныя, самыя вясёлыя загадкі.

## ТАЛЕНТЫ ЛІТАРАТУРНАГА СЛОВА

Папулярызацыя творчасці пісьменнікаў і паэтаў з’яўляецца галоўным напрамкам дзейнасці бібліятэк сістэмы. Для больш поўнага раскрыцця жыццёвага і творчага шляху юбіляраў у кожнай бібліятэцы аформлены “Літаратурны каляндар”, праводзяцца агляды літаратуры. Бібліятэкары прыцягваюць увагу карыстальнікаў да чытання беларускіх твораў і асабліва літаратараў-юбіляраў.

### *95 гадоў з дня нараджэння Івана Навуменкі*

“Творчасць Івана Навуменкі – адметная з’ява ў беларускай літаратуры. Значная частка яе прысвечана Вялікай Айчыннай вайне. Бо вайна стала неад’емнай часткай яго біяграфіі і правяла будучага пісьменніка па многіх франтавых дарогах. Не адзін раз даводзілася яму глядзець у твар смерці. Таму так часта вяртаецца пісьменнік у мінулае, да вайны ў сваіх творах”. З такіх слоў пачалася юбілейная вечарына “Салдат вялікай вайны… Генерал вялікай літаратуры” ў *Забалацкай ІСБ.*

Таксама увазе чытачоў была прадстаўлена мультымедыйная прэзентацыя аб жыцці і творчасці пісьменніка і агляд кніг па ваеннай тэматыцы.

Агляд літаратуры “Іван Навуменка і яго кнігі” прапанавала *Місявіцкая СБ*, літаратурна-музычную кампазіцыю “Аб чым шумелі сосны” *Нацкая СБ.*

У *Жырмунскай ІСБ* для вучняў 5 класа быў праведзены слайд-рэпартаж “Музыка ў прозе Івана Навуменка”. Увазе дзяцей была прадстаўлена электронная прэзентацыя з інфармацыяй аб дзяцінстве пісьменніка, аб ўдзеле у абароне радзімы, аб навуковай і пісьменніцкай дзейнасці, аб яго ўзнагародах. Таксама дзеці пазнаёміліся з кнігамі, якія ёсць ў фондзе бібліятэкі: “Сасна пры дарозе”, “Вецер у соснах”, “Сорак трэці”, “Дзяцінства”, “Падлетак”, “Юнацтва” і інш.

У астатніх бібліятэках чытачы знаёміліся з творчасцю пісьменніка праз кніжныя выставы: “Іван Навуменка і яго кнігі”, “Дарогі пісьменніка”, “Іван Навуменка – яркі, самабытны талент” і ншыя.

## *75 гадоў з дня нараджэння Таісы Бондар*

Гэта падзея ў бібліятэках была адзначана літаратурным партрэтам “Таіса Бондар – чалавек складаны, з багатым унутраным жыццём” (*Бастунская ІСБ*), літаратурнай старонкай “Твая прысутнасць” (*Пагародзенская СБ*), паэтычнай хвілінкай “І голас набыла душа” (*Місявіцкая СБ*), літаратурна-паэтычнай гадзінай “Паэзія душы Таісы Бондар” (*Канвелішская СБ*).

## *85 гадоў з дня нараджэння Рыгора Барадуліна*

Да юбілею беларускага пісьменніка Р. Барадуліна *Воранаўская ДБ* правяла вершаваны серпанцін “Рыгор Барадулін - паэт, які стварае мову”, падчас якога дзеці малодшага школьнага ўзросту чыталі жартоўныя і гумарыстычныя вершы, небылічкі, казкі-пераказкі, дражнілкі, калыханкі, забаўлянкі і іншыя творы.Літаратурная хвілінка “Чараўнік слова” ладзілася ў *Радунскай ГПБ* для выхаваўцаў дзіцячага сада. Да ўвагі дзяцей была прадстаўлена новая серыя кніг на беларускай мове “Нашым дзеткам”. Юныя слухачы ўважліва слухалі бібліятэкараў, а затым прыпаміналі герояў твораў і іх учынкі.

*Беняконскай СБ-МЭ* была праведзена вершаваная старонка “Рыгор Барадулін – любімец дзецям”. Аповед пра жыццёвы і творчы шлях паэта суправаджаўся яго незабыўнымі вершамі: “Неру”, “Я слаўлю мамы светлае імя”, “Забяры мяне, любая мама”, “Я вас чакаў з вясны....”. Прагучала знакамітая песня “Трэба дома бываць часцей”, музыку да якой напісаў І.Лучанок ў выкананні Насці Белазомб і Валерыі Мацкевіч. Слухалі запіс верша “Бацьку” у выкананні аўтара, глядзелі фільм “Рыгор Барадулін”.

*Забалацкая ІСБ* прапанавала дзецям вершаваную старонку Рыгор Барадулін – любімец дзяцей”, *Бастунская ІСБ, Больцішская ІСБ, Гіркаўская СБ, Доцішская СБ, Місявіцкая СБ, Радунская ГПБ* пазнаёмілі з кніжнымі выставамі “Чараўнік слова”, “Чараўнік паэтычнай стыхіі”, “Паэтычны свет Рыгора Барадуліна, “Рыгор Барадулін – паэт, які стварыў мову”, “Рыгор Барадулін любімец дзяцей”.

***180-годдзю з дня нараджэння Францішка Багушэвіча*** прысвячаліся наступныя мерапрыемствы:

- выставы-прагляды “Паэт долі народа”, “Сейбіт вечнага” (*Больцішская ІСБ, Гіркаўская СБ* );
- літаратурная імпрэза “Той люд жыве, што свае песні мае…” (*Доцішская СБ*);
- літаратурная гасцёўня “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…” (*Беняконская СБ-МЭ*);
- агляд літаратуры “Каб яго пачулі, каб яго пазналі”(*Радунская ГПБ);*
- літаратурная гадзіна “Аб сабе хачу пакінуць памяць”(*Жырмунская ІСБ*);
- літаратурны вечар “Аб сабе хачу пакінуць памяць…”(*Бастунская ІСБ*);
- гутарка “Пясняр Беларусі”(*Пераганцаўская СБ*);
- кніжныя выставы: “Аб сабе хачу пакінуць памяць”, “Багушэвіч і яго час”, “Дудар Беларусі”, “Сейбіт вечнага”, “Паэт долі народнай”, “Жыць, служыць і тварыць для народа”.

*Канвелішская СБ* разам з чытачамі далучылася да абласной акцыі “Чытаем разам творы беларускіх пісьменнікаў-юбіляраў” падчас літаратурнай гасцёўні “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…” прысвечаннай 180-годдзю з дня нараджэння Францішка Багушэвіча. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з цікавымі фактамі з біяграфіі, з творчым шляхам. Дзяўчынкі падэкламавалі вершы паэта. Таксама увазе прысутных была прадэманстравана відэапрэзентацыя.

*Воранаўская ДБ* да ***90-годдзя*** з дня нараджэння беларускага пісьменніка ***Яраслава Пархуты*** правяла казачны марафон “Казкі дзеда Яраслава” з вучнямі 3 класа. Бібліятэкары расказалі пра

жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, пазнаёмілі з дзіцячымі кнігамі, якія адрозніваюцца сваёй дасціпнасцю і займальнасцю. Для ўвагі вучняў былі прадстаўлены казкі: “Перапёлачка”, “Козлік-цымбаліст” і “Мурашык”.

**Да *65-годдзя*** з дня нараджэння беларускага паэта і пісьменніка ***Анатоля Зэкава*** *Воранаўская ДБ* прапанавала літаратурныя замалёўкі “Верш з усмешкаю сябруе”. Вучні 3 класаў пазнаёміліся з жыццёвым і творчым шляхам, чыталі яго вершы, загадкі, скорагаворкі, урыўкі з казак.

## МОВА – ДУША НАРОДА

*Канвелiшская* СБ з выхаванцамі дзіцячага сада ладзіла гульню “У госці да бабулі Марылі”.



*Бастунская ІСБ* прапанавала гучныя чытанні твораў на роднай мове “Твая першая кніжка па беларуску” таксама для выхаванцаў дзіцячага сада.

У *Забалацкай ІСБ* прайшла гадзіна роднай мовы “Мілагучнае, звонкае роднае слова”. Размова ішла пра гісторыю ўзнікнення беларускай мовы, а таксама пра неабходнасць захоўваць яе. На мерапрыемстве гучалі вершы пра мову, пашыралі свой слоўнікавы запас і праяўлялі творчыя здольнасці. Таксама прынялі ўдзел у гульні, дзе паказалі добрыя веды ў перакладзе слоў з рускай на беларускую мову, разгадвалі загадкі і рэбусы.

*Радунская ГПБ* арганізавала PR- акцыю “Перакладзі слова – успомні мову”. У гэты дзень з наведвальнікамі бібліятэкі размова вялася толькі на беларускай мове, чытачам прапанавалі ўспомніць беларускія прыказкі і прымаўкі, былі праведзены гульні і віктарыны.

Супрацоўнікі *Воранаўскай ДБ* таксама арганізавалі для вучняў 5–х класаў гучныя чытанні твораў на роднай мове “Роднай мовы пералівы”. Удзельнікі мерапрыемства дакрануліся да крыніц беларускай мовы, пазнаёміліся з вершамі, апавяданнямі, казкамі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Васіля Быкаваі іншых. Успомнілі беларускія прыказкі і прымаўкі, загадкі і прыкметы, жарты і лічылкі, паўдзельнічалі ў конкурсе на лепшага знаўцу беларускага фальклору “Моўныя скарбы беларускай мовы”, пазнаёміліся з кніжнай выставай “Беларуская мова? З задавальненнем”.

*Жырмунская ІСБ* арганізавала вусны часопіс “Беларус, твая мова лепшая ў свеце”. Дзеці падарожнічалі па старонках часопіса.

Першая старонка “Адкуль мы родам” была прысвечана гісторыі беларускай мовы, другая – “Падумай і адкажы” на якой дзеці адказвалі на пытанні загадак-жартаў. Цікавай была трэцяя старонка “Прыказкі і прымаўкі”, на чацвёртай старонцы “Паспрабуй і перакладзі” вучні з задавальненнем перакладвалі словы з рускай мовы на беларускую.

У *Пагародзенскай СБ* прайшла літаратурна-паэтычная акцыя “Слова роднае – вечнасці след”. Гаварылі аб роднай мове, яе важнай ролі для народа і краіны, яе гісторыі і сённяшнім стане.

## У ЗГОДЗЕ З ПРЫРОДАЙ

У рамках акцыі “Час зямлі” супрацоўнікі *Радунскай ГПБ* правялі экалагічную гадзіну “Дзень зямлі” для вучняў пачатковых класаў. Увазе навучэнцаў былі прадстаўлены кароткія звесткі аб планеце Зямля, даведаліся пра экалагічны стан у Рэспубліцы Беларусь, аб уздзеянні чалавека на прыроду. Затым падзяліўшыся на дзве каманды прынялі ўдзел у розных турах экалагічнай гульні.

## КАРЫСТАЛЬНІКАМ ПРАВАВЫЯ ВЕДЫ

**Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь**

Галоўнаму закону нашай краіны бібліятэкі прысвяцілі: брэйн-рынг “Галоўны закон Беларусі” (*Воранаўская ДБ*), урок прававой культуры “Все мы соблюдать должны основной закон страны” (*Доцішская СБ*), тэматычныя паліцы “Сімвал нашай дзяржаўнасці”, “Канстытуцыя. Чалавек. Дзяржава”, “Закон па якім жыве краіна” *(Радунская ГПБ, Канвелішская СБ, Бастунская ІСБ*), інфармацыйныя гадзіны, гадзіны прававых ведаў “Галоўны дакумент краіны”, “Канстытуцыя - фундамент дзяржаўнага будаўніцтва”, “Канстытуцыя - аснова прававой сістэмы дзяржавы” (*Пераганцаўская СБ, Місявіцкая СБ, Забалацкая ІСБ, Нацкая* СБ).

## САМАЯ ЛЕПШАЯ НА СВЕЦЕ

Літаратурна-музычную кампазіцыю "Дазволь жынчына, у ногі пакланіцца" і "Усмешкай мамінай сагрэты" ладзілі бібліятэкары *Доцішскай і Пераганцаўскай СБ*. Вершаваную старонку "Усе вершы Вам, матулі!" арганізавала *Бастунская ІСБ*. Віншавальную выставу "Жаночае шчасце" ладзіла *Больцішская ІСБ*. Ранішнік "Зазірніце ў маміны вочы" прайшоў *Пагарodзенскай СБ*. *Беняконская СБ-МЭ* арганізавала святочны вернісаж "Для вас, нашы матулі!". Святочную сустрэчу для дзяцей "З гонарам пра маці" арганізавала *Забалацкая ІСБ*. На майстар-клас "Падарунак маме" запрасіла *Канвелішская СБ*. Фотавыставу "Мама, усміхнісь" і гадзіну паэзіі "Дарагі мой чалавек" арганізавала *Воранаўская ДБ*. "Усе вершы вам, матулі!" прысвяцілі матулям удзельнікі вершаванай старонкі ў *Жырмунскай ІСБ*.



## УДАСКАНАЛЬВАЕМ ПРАФЕСІЙНАЕ МАЙСТЭРСТВА

Павышэнне кваліфікацыі, удасканаленне прафесіяналізму бібліятэчных спецыялістаў раёна з'яўлялася адным з вядучых напрамкаў метадычнай работы.

31 снежня быў арганізаваны практыкум для бібліятэкараў "Уліковыя формы работы: правілы афармлення".

14 лютага адбыўся круглы стол "Аматарскія аб'яднанні і клубы па інтарэсах – дзейсная форма работы бібліятэкі па арганізацыі вольнага часу насельніцтва".